

# 40 гадоў на варце харчовай бяспекі рэспублікі

Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт харчавання адзначае 40-годдзе з дня адкрыцця. Праграма святкавання юбілею ўніверсітэта разгарнулася на тры дні і ўключыла выставы работ гурткоў, творчых прац супрацоўнікаў ўніверсітэта, навукова-тэхнічных дасягненняў, сустрэчы на кафедрах выпускнікоў, разнастайныя экскурсіі, а таксама спартыўныя, інтэлектуальныя і творчыя мерапрыемствы. Удзел у святкаванні юбілею прымалі міністр адукацыі рэспублікі Сяргей Маскевіч, губернатар вобласці Пётр Руднік, а таксама іншыя ганаровыя госці, сярод якіх прэзідэнт праўлення польскага АТ "Спомаш" Хенрык Ян Хальбедэль, рэктар Плоўдзіўскага ўніверсітэта Балгарыі Кольа Дзінкаў і прарэктар Маскоўскага ўніверсітэта тэхналогій і кіраўніцтва імя Разумава Ігар Нікадзімаў.

►►► 5 стар.

◄◄◄ 1 стар.

# 40 гадоў на варце харчовай бяспекі рэспублікі

З юбілеем універсітэт павіншаваў Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка. Адкрываючы святочны сход, міністр адукацыі Сяргей Аляксандравіч Маскевіч зачытаў прывітальны адрас кіраўніка дзяржавы:

— Сёння ваша ВНУ з'яўляецца буйным навучальным і даследчым цэнтрам Беларусі, дзе рыхтуюць высокакваліфікаваныя кадры, актыўна развіваюць навуковыя школы, якія атрымалі прызнанне не толькі ў нашай краіне, але і далёка за яе межамі. Ваш калектыў уносіць дастойны ўклад у вырашэнне актуальных задач захавання харчовай бяспекі рэспублікі, павышэння якасці жыцця нашых грамадзян. Упэўнены, што і ў далейшым універсітэт харчавання будзе працаваць гэтак жа творча і плённа, памнажаючы слаўныя навучальныя і навуковыя традыцыі, выхоўваючы сапраўдных прафесіяналаў і патрыётаў сваёй Айчыны.

Сяргей Аляксандравіч далучыўся да цёплых слоў віншавання прэзідэнта, а таксама ва ўрачыстай абстаноўцы ўручыў ганаровыя граматы Міністэрства адукацыі рэспублікі рэктару ўстановы вышэйшай адукацыі Вячаславу Шаршунову і ўсяму калектыву ўніверсітэта. Знакам "Выдатнік адукацыі Рэспублікі Беларусь" былі адзначаны дэкан факультэта давузаўскай падрыхтоўкі Алена Андрэйчыкава, прарэктар па вучэбнай рабоце і павышэнні кваліфікацыі Ігар Давідовіч, дацэнт кафедры аўтаматызацыі і тэхналогіі харчовых вытворчасцей Мікалай Дарагоў і дырэктар Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў Алена Урбанчык.

Звярнуўся з прывітальным словам да прысутных і рэктар установы адукацыі Вячаслаў Шаршуноў.

— Універсітэт харчавання — адзіная вышэйшая навучальная ўстанова нашай рэспублікі, якая вядзе падрыхтоўку інжынераў-тэхнолагаў, інжынераў-механікаў і эканамістаў для харчовай, перапрацоўчай і хімічнай галін прамысловасці. У цяперашні час на дзённым і завочным аддзяленнях навучаецца 6900 студэнтаў па 47 спецыяльнасцях і спецыялізацыях. — У склад універсітэта ўваходзяць шэсць факультэтаў, дваццаць кафедр, Інстытут павышэння кваліфікацыі і падрыхтоўкі кадраў. На іх працуюць каля 300 выкладчыкаў, у тым ліку 12 дактароў навук і 116 дацэнтаў і кандыдатаў навук. Усе яны наш залаты запас, які дазволіў атрымаць усё тое, што мы маем сёння. У рэктарата ўніверсітэта ёсць усе падставы меркаваць, што наш калектыў, і перш за ўсё нашы выпускнікі, уносіць дастойны ўклад у развіццё харчовай і перапрацоўчай прамысловасці краіны, што мы паспрабуем рабіць і ў далейшым, — паабяцаў Вячаслаў Аляксеевіч.

На сходзе выступілі і іншыя госці, кожны з якіх прыйшоў на свята не з пустымі рукамі, а з ганаровымі граматамі і ўзнагародамі для педагогаў і супрацоўнікаў універсітэта. Самы значны падарунак быў уручаны кіраўніцтву ўніверсітэта ад кіраўніцтва вобласці. Ім сталі сучасны камп'ютарны клас і новы мікрааўтобус. Завяршыўся сход святочным канцэртам, на якім свае нумары прысутным дарылі самадзейныя артысты з ліку студэнтаў універсітэта. Іх разнажанравыя, арыгінальныя выступленні, выкананыя на даволі высокім мастацкім узроўні, выклікалі ў гледачоў шквал апладысментаў ды хвалю добрага настрою.

Падчас святочных мерапрыемсіваў усе жадаючыя мелі магчымасць прыняць удзел у экскурсіі па ўніверсітэце "Кожны павінен быць велічны ў сваёй справе", наведаць куток першага рэктара Аляксандра Бясчаснага, розныя навучальныя лабараторыі і музей гісторыі ўніверсітэта; наведаць "Урокі ведаў і сустрэч", падчас якіх цяперашнія студэнты змаглі пагутарыць і пераняць вопыт у выпускнікоў, а таксама паназіраць за фінальнымі матчамі першынства ўніверсітэта па валейболе, турнірам інтэлектуальных гульняў сярод каманд супрацоўнікаў і студэнтаў універсітэта "Таямніцы майстэрства — у спадчыну пакаленняў". Не пакінула нікога раўнадушным і выстава — дэгустацыя прадукцыі прадпрыемстваў харчовай прамысловасці рэспублікі.

**Ганна СІНЬКЕВІЧ.**